самым аўтар сцвярджае, што духоўнасць можна адрадзіць толькі праз зварот да сваіх першакрыніц. Менавіта паэты, якіх нарадзіла зямля, а не асфальт, здольны, на думку В. Шніпа, адлюстраваць асновасутнаснае ў існаванні беларускай нацыі і знайсці новыя шляхі развіцця яе клуьтуры.

Л. Рублеўская ў адрозненне ад свайго мужа, В. Шніпа, нарадзілася ў горадзе і з'яўляецца гараджанінам у трэцім пакаленні. Як сцвярджае сама аўтарка, "…я – ваяўнічы урбаніст. Вёска для мяне нешта зусім чужое" [2, с. 6]. І калі ў паэзіі Л. Рублеўскай згаданая "ваяўнічасць" адкрыта не выяўляецца, хаця неаднаразова падкрэсліваецца культурна-гістарычная значнасць гарадской прасторы, то ў інтэрв'ю паэтка настойліва сцвярджае: "Гэта проста вялікі шанц для беларускай культуры, што цяпер беларускамоўныя паэты нараджаюцца сярод вертыкаляў горада" [2, с. 7].

**Літаратура**

1 Шніп, В. Страла кахання, любові крыж : паэзія і проза / В. Шніп. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 270 с.
2 З Людмілай Рублеўскай гутарыць Галіна Булыка // Крыніца. – 2000. – № 11–12. – С. 4–16.

## МІЖПРАДМЕТНАЯ СУВЯЗЬ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ СІНОНІМАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Т. І. Несцярчук*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
*Навук. кір.* ***В. Я. Барысенка,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

Урокі ў пачатковых класах выконваюць не толькі пазнаваўчую і развіваючую функцыю, але і выхаваўчую. Так, у падручніках па мове прапаноўваецца вывучэнне розных ветлівых слоў і сінонімаў да іх: "***выбачайце***", "***даруйце***", "***прабачце***" [1, с. 24]. Гэта папаўняе слоўнікавы запас вучняў, спрыяе развіццю маўлення. А ўжо ў падручніку для чытання гэтыя ж словы ўжываюцца ў вершах, апавяданнях, казках, што безумоўна, падымае ўзровень выхаванасці ў дзяцей:

"***Калі ласка***", "***дзякуй***",
"***Добры дзень***" –
*Ветлівыя словы*
*Чую ад людзей* [2, с. 26].

Для таго, каб кругагляд дзяцей пашыраўся, неабходна вывучаць словы-сінонімы, якія ўжываюцца ў розных стылях мовы і маюць розную стылістычную афарбоўку. Гэта прадугледжана і аўтарамі падручнікаў. Так, на уроках беларускай мовы, дзеці праз тэкст могуць даведацца, што да дзеяслова "***ісці***", які нейтральны ў стылістычных адносінах і мае значэнне 'рухацца', можна падабраць наступныя сінонімы: "*крочыць*", "*ступаць*", "*тупаць*" [3, с. 59–62]. Засваенне гэтых слоў спрыяе таму, што пры чытанні твораў, дзеці ўжо не сустрэнуцца з цяжкасцямі іх разумення.

Трэба адзначыць і тое, што ў падручніках па мове і чытанню пры падачы сінонімаў выкарыстоўваюцца словы розных часцін мовы: **назоўнікі**: *сонца – свяціла* [1, с. 60–61]; **дзеясловы**: *лётаюць – пікіруюць, расказаць – паведаміць* [3, с. 72]; **займеннікі**: *сабачка – ён* [3, с. 50]; **прыметнікі**: *касы – заяц* [1, с. 40]. Гэта спрыяе папаўненню слоўнікавага запасу дзяцей і робіць іх маўленне прыгожым, вобразным і па-свойму эмацыянальна насычаным.

Такім чынам, вывучаючы словы-сінонімы ў пачатковай школе, неабходна праводзіць сувязь паміж урокамі мовы і літаратурнага чытання. Гэта спрыяе ўзбагачэнню мовы дзяцей, яе ўпрыгожванню, а таксама развіццю пазнаваўчай дзейнасці вучняў і іх агульнай культуры.

**Літаратура**

1 Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне : падручнік для 2-га кл. агульнаадукац. устаноў з бел. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 1 / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 120 с.: іл.

2 Вольскі, А. В. Беларусачка : падручнік для 2-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з рускай мовай навучання / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 128 с.: іл.

3 Волынец, Т. М. Літаратурнае чытанне : падручнік для 3-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання: у 2 ч. Ч. 1 / Т. М. Валынец [і інш.]. – Мінск : НІА, 2007. – 120 с.

## ОЦЕНОЧНАЯ ЛЕКСИКА В ВОСПОМИНАНИЯХ СОВРЕМЕННИКОВ М. Ю. ЛЕРМОНТОВА

***А. Л. Павлюченко** (УО «ГГУ им. Ф. Скорины»)*
*Науч. рук.* ***И. И. Кобыш,***
*канд. филол. наук, доцент*

Образ М. Ю. Лермонтова привлекал и привлекает внимание исследователей своей противоречивостью. Воспоминания современников отражают наиболее объективную информацию о поэте. Особое место в создании его образа занимает оценочная лексика – основное средство описания личности, воспринимаемой людьми по-разному. Составленный нами частотный словарь оценочных слов, зафиксированных в воспоминаниях современников М. Ю. Лермонтова, позволяет выделить три основных аспекта – внешность, характер, талант [1]. При описании внешности активнее используются оценочные прилагательные с отрицательной оценкой: *«невзрачен»; «некрасивое сложение», «маленький ростом, кривоногий, с большой головой, с непомерно широким туловищем»* [1, с. 233]; *«очень некрасив собой, крайне неловок»* [1, с. 309]; *«приземистый, маленький ростом, с большой головой и бледным лицом»* [1, с. 119].

Авторы воспоминаний о М. Ю. Лермонтове обращают внимание на его глаза, взгляд. Оценочная лексика позволяет передать как восторг: *«самым привлекательным в нем были глаза – большие, прекрасные, выразительные»* [1, с. 121]; *«глубокие, умные и пронзительные черные глаза»* [1, с. 121], так и другие чувства современников: *«во время вспышек гнева они бывали ужасны»; «ядовитость во взгляде, полном презрения насмешки и вместе с тем сожаления»* [1, с. 221]. При описании характера поэта наиболее часто использовались оценочные прилагательные *беспечный, живой, впечатлительный, приятный, услужлив, любезен, рассеян, невнимателен, злоязычен, тяжелый, капризный.* Только в оценке таланта М. Ю. Лермонтова его друзья и враги были едины, об этом говорит лексика, подчеркивающая живописность, музыкальность, силу, крепость, яркость, превосходство, глубину, точность, свежесть, правдивость его таланта: *«исполинский взмах», «демонский полет», «дьявольский талант», «глубокий* и *чисто непосредственный вкус изящного», «беспощадная искренность».*

Противоречивость образа М. Ю. Лермонтова, созданного современниками, обусловлена как самой личностью поэта, так и их отношением к нему, вкусами, литературными способностями.

**Литература**

1 М. Ю. Лермонтов в воспоминаниях современников : [посвящ. 175-летию со дня рождения] / редкол. : В. Э. Вацуро [и др.] — М. : Худож. лит., 1989. – 671 с.